**ТЫПЫ СКЛАДАНЫХ СКАЗАЎ З РОЗНЫМІ ВІДАМІ СУВЯЗІ**, разнавіднасці складаных сказаў у залежнасці ад спосабу і характару сувязі іх прэдыкатыўных частак. Складаныя сказы камбінаванай будовы размяжоўваюцца на тры групы:

*У першую групу* ўваходзяць сказы, структурныя часткі якіх арганізаваны на ўзор складаназалежных або бяззлучнікавых сказаў і звязаны пры дапамозе злучальных злучнікаў: {*Падстаўляюць чашкі кветкі – хочуць піць пасля спякоты*}, *а*{*ільнам, бы нам, няўседкі – ліўнем мыюцца з ахвотай*}(Я. Сіпакоў); {*Яны* [ласі] *не чуюць завірухі, ціш першабытная кругом*}, *і* {*выстрал, што ўдарыць глуха, ім прагучыць, як летні гром*} (М. Танк).У такіх сказах структурная частка можа звязвацца з асобнай прэдыкатыўнай, якая (па сутнасці) выступае як структурная: {*Ідуць касцы, звіняць іх косы, вітаюць іх буйныя росы*}, *а* {*краскі ніжай гнуць галовы, пачуўшы косак звон сталёвы*} (Я. Колас).

*У другую групу* ўключаюцца сказы, структурныя часткі якіх арганізаваны на ўзор складаназлучаных або бяззлучнікавых сказаў і звязаны пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў. У гэтую разнавіднасць уваходзяць і сказы, якія ўключаюць у свой склад некалькі даданых частак, звязаных з некалькімі галоўнымі:{*Колькі б мы ні хадзілі па  тваіх дарогах, колькі б вёснаў ні сустракалі пад дахам тваіх нябёс, колькі б разоў ні наталялі смагу твае ручаіны з баравою вадою*},{*ніколі не здасца чэрствым твой хлеб і ніколі не будзе скупою рука твая, Бацькаўшчына!*} (М. Лужанін). У такіх сказах структурная частка можа звязвацца з асобнай прэдыкатыўнай: {*То дожджык, то сонца, то вецер*}, {*што згортвае хвалі ў баранчыкі*} (Я. Брыль).

*Да трэцяй групы* адносяцца сказы, структурныя часткі якіх арганізаваны на ўзор складаназлучаных або складаназалежных сказаў і звязаны пры дапамозе бяззлучнікавай сувязі: {*Калі хмары не закрываюць месяца і зорнае неба чыстае і высокае, усю ноч зіхаціць сваім хараством, на полі далёка відаць*}*:*{ *ці лес, ці асобнае дрэва, ці хата далёк будзе чарнецца, хоць і ніяк нельга выразна бачыць, што гэта такое*} (К. Чорны); {*А лісічак набраў каля сцежкі-вяртухі, што да хаты лісінай лагчынай вяла;*}{ *падбярозавікаў – пад бярозай-шаптухай, дзе капэла чмяліная пела-гула*} (М. Танк). І ў такіх сказах структурная частка таксама можа звязвацца з асобнай прэдыкатыўнай: {*Абагрэтая сонцам вуліца, затравелыя двары нібы драмалі*}*:*{*гон веснавы сышоў ужо, а летні яшчэ не пачаўся*} (І. Мележ).

Сувязь паміж прэдыкатыўнымі часткамі складанага сказа з рознымі відамі сувязі можа мець як злучальны, так і далучальны характар: {*Спачатку гром грымеў у далях і хмарай хмарыўся заход, пасля вятры затанцавалі*} – {*то навальніца ішла ў паход*} (М. Машара).

Складаныя сказы камбінаванай будовы распаўсюджаны ў сучаснай беларускай літаратурнай мове, асабліва ў мастацкім і публіцыстычным стылях. Гэтыя канструкцыі з’яўляюцца, як правіла, самымі аб’ёмнымі па структуры і адпаведна найбольш інфармацыйна насычанымі.

*С.С.Мароз*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ